# Смерць работніка на вытворчасці!

У маі 2019 г. у адным з буйных прадпрыемстваў г. Смаргонь Гродзенскай вобласці пры выкананні рамонтных работ скрабковага ланцужнога канвеера адбыўся няшчасны выпадак з 22-гадовым слесарам па рамонце і абслугоўванні абсталявання, які прывёў да смяротнай вытворчай траўмы.

Спецыяльным расследаваннем няшчаснага выпадку ўстаноўлена, што прычынай няшчаснага выпадку з'явілася невыкананне абавязкаў па ахове працы кіраўніком структурнага падраздзялення, які да заканчэння рамонтных работ канвеера, не забяспечыўшы ўстаноўку верхняга ахоўнага вечка канвеера перад выпрабавальным пускам, падключыў канвеер да крыніцы электрасілкавання, тым самым не выключыў выпадковы пуск канвеера, у выніку чаго работнік з прычыны пуску канвеера быў уцягнуты верцяшчыміся элементамі абсталявання канвеера ў яго ніжнюю частку.

З мэтай прафілактыкі вытворчага траўматызму пры выкананні работ па тэхнічным абслугоўванні і рамонце транспартных сродкаў бесперапыннага дзеяння (канвеераў) нагадваем, што згодна з п. 132 Міжгаліновых агульных правілаў па ахове працы, зацверджаных пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь 03.06.2003 №70, п. 31 Міжгаліновых правілаў па ахове працы пры эксплуатацыі канвеерных, трубаправодных і іншых транспартных сродкаў бесперапыннага дзеяння, зацверджаных пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь 10.04.2007 №54, работы па тэхнічным абслугоўванні і рамонце абсталявання павінны выконвацца пры выключаным абсталяванні. Пры гэтым абсталяванне адключаецца ад усіх крыніц энергіі і прымаюцца меры супраць яго выпадковага ўключэння.

Святлана Шатохіна,
начальнік Смаргонскага міжраённага аддзела Гродзенскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы